# ІНСТРУКЦЫЯ

аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу гарманістаў, баяністаў, акардэаністаў ”Вішнёвыя найгрышы“ у межах Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу гарманістаў, баяністаў, акардэаністаў ”Вішнёвыя найгрышы“ у межах Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“ (далей – конкурс).

Мэтай і задачамі конкурсу з’яўляюцца:

адраджэнне і распаўсюджванне народнага інструментальнага мастацтва ў асяроддзі прафесіяналаў і аматараў;

адкрыццё новых імёнаў і талентаў у галіне інструментальнага мастацтва;

удасканаленне выканаўчага майстэрства інструментальнага мастацтва;

пазіцыянаванне сучаснага інструментальнага мастацтва як неад’емнай часткі культуры Рэспублікі Беларусь;

абмен творчымі ідэямі і практычным вопытам.

2. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт (далей – райвыканкам), аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама (далей – аддзел) (далей – арганізатары конкурсу).

Для ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца прафесійныя і аматарскія выканаўцы з Рэспублікі Беларусь і замежных краін. Па складу самадзейныя выканаўцы на народных інструментах (гармонь, баян, акардэон) могуць быць салісты, інструментальныя ансамблі з гарадоў і раёнаў Віцебскай вобласці, Рэспублікі Беларусь і замежных краін. Выступленні могуць суправаджацца танцамі, песнямі, ігрой на іншых народных інструментах.

Заяўкі дасылаюцца на эл.адрас: glubokoe_ctknt@mail.ru;

тэлефоны для даведак: 8 02156 23007 (Дзмітрый Леанідавіч); 8 02156 22420.

3. Умовы правядзення:

Удзельнікі конкурсу павінны прадставіць 2 творы, рознабаковыя па характары: адзін з іх павінен быть нацыянальнага характару альбо нацыянальнага аўтара. Працягласць кожнага твора не больш 5 хвілін.

Парадак выступлення вызначае аргкамітэт.

4. Выступленне ўдзельнікаў ацэньвае прафесійнае журы.

Крытэрыі ацэнкі ўзроўню выканальніцкай (інструментальнай) падрыхтоўкі:

ступень мастацкага ўвасаблення музычнага ладу твораў;

тэхнічная дасканаласць выканання;

ступень складанасці праграмы;

стылёвая і стылістычная разнастайнасць абранага музычнага матэрыялу.

Журы:

ацэньвае выкананне ўдзельнікамі конкурсу твораў;

афармляе пратаколы вынікаў выкананняў удзельнікамі конкурсу;

вызначае пераможцаў конкурсу ў кожнай намінацыі;

інфармуе ўдзельнікаў конкурсу аб выніках іх удзелу ў конкурсе.

Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляецца журы адкрытым галасаваннем па кожнаму з удзельнікаў конкурсу.

Рашэнні журы з’яўляюцца канчатковымі і пераглядy не падлягаюць.

5. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў:

лепшыя выканаўцы ўзнагароджваюцца дыпломам ”Гран-пры“ і дыпломамі Лаўрэата I, II, III ступеняў.

Удзельнікі, якія не занялі прызавыя месцы, узнагароджваюцца заахвочвальнымі дыпломамі ў намінацыях:

высокае выканальніцкае майстэрства;

адраджэнне і распаўсюджванне традыцый музычнага мастацтва;

захаванне і прапаганда музычнага мастацтва;

выяўленне і падтрымка таленавітай моладзі;

лепшае выкананне народнай музыкі;

лепшае выкананне твора патрыятычнай накіраванасці;

любоў да народнай музыкі;

захаванне нацыянальных традыцый;

актуальнасць і навізна зместу рэпертуару;

захаванне нацыянальнай культуры і спадчыны;

лепшае сольнае выкананне твору ў суправаджэнні калектыву.